Источник: "Настаўніцкая газета" - 2013-01-22

# Філасофская навука і адукацыя спалучылі свае магчымасці

**Учора ў Інстытуце філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі адбылося ўрачыстае адкрыццё філіяла кафедры філасофіі і метадалогіі навукі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Падзею прымеркавалі да Дня беларускай навукі.**

►►► 2 стар.

Аляксандр Андрыянаў. Філасофская навука і адук

# Філасофская навука і адукацыя спалучылі свае магчымасці

◄◄◄ 1 стар.

Такім чынам на базе Інстытута філасофіі пачынаецца апрабацыя новай формы арганізацыі навуковага працэсу — вучэбна-даследчага комплексу па філасофскіх навуках. Плануецца, што ў яго межах студэнты-гуманітарыі атрымаюць магчымасць паспрабаваць свае сілы ў рэальнай даследчай дзейнасці па заданнях дзяржпраграм, узяць удзел у рэспубліканскіх і міжнародных праектах, а таксама выкарыстоўваць свае веды і навыкі ў камерцыялізацыі навуковых ідэй і аказанні экспертна-кансультацыйных паслуг.

Філіял кафедры мае на ўвазе прыцягненне вядучых спецыялістаў Інстытута філасофіі да выкладання ў БДУ, кіраўніцтва курсавымі, дыпломнымі і магістарскімі работамі. У інстытуце будзе наладжана павышэнне кваліфікацыі і стажыроўка навукова-педагагічных кадраў Белдзяржуніверсітэта. Запланавана сумесная прафарыентацыйная работа, арганізацыя навукова-практычных мерапрыемстваў.

Напрыклад, мяркуецца інтэграваць навукова-метадычны семінар выкладчыкаў БДУ з філасофска-метадалагічнымі семінарамі, якія вось ужо некалькі гадоў праходзяць у НАН Беларусі. Гэта дазволіць выпрацаваць новыя падыходы да выкладання філасофіі ва ўмовах рэформы сацыяльна-гуманітарных дысцыплін у вышэйшай школе, увядзення модульнай сістэмы. Плённым будзе, на думку двух бакоў, спалучэнне магчымасцей семінараў маладых навукоўцаў і аспірантаў. Адкрываюцца новыя гарызонты для больш шырокага абмеркавання і апрабацыі вынікаў дысертацыйных даследаванняў, сумеснай падрыхтоўкі навукова-практычных, інавацыйных праектаў.

Як паведаміла прэс-служба НАН Беларусі, загад аб стварэнні філіяла вядучай філасофскай кафедры рэспублікі ў Інстытуце філасофіі падпісалі кіраўнікі дзвюх устаноў напрыканцы 2012 года. Гэтае рашэнне стала чарговым крокам у наладжванні ўзаемадзеяння гуманітарнай навукі і адукацыі ў нашай краіне.

Варта зазначыць, што гэта не першы філіял кафедры Белдзяржуніверсітэта ў галоўнай навуковай арганізацыі краіны. Напрыклад, не далей чым у лістападзе 2012 года адкрыўся філіял кафедры батанікі БДУ ў Інстытуце эксперыментальнай батанікі імя В.Ф.Купрэвіча.

Па даных прэс-службы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, колькасць філіялаў кафедр БДУ ў арганізацыях, кампаніях, на прадпрыемствах набліжаецца да 50. Так, хімічны факультэт мае тры філіялы на базе акадэмічных інстытутаў хімічнага профілю, эканамічны факультэт — чатыры філіялы (на базе Асацыяцыі беларускіх банкаў, Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі і інш.). У Інстытуце філасофіі ўжо дзейнічаў дагэтуль філіял кафедры паліталогіі юрыдычнага факультэта БДУ.

**Аляксандр АНДРЫЯНАЎ.**

Аляксандр Андрыянаў. Філасофская навука і адукацыя спалучылі свае магчымасці